***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар*

# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ ГУМАНІТАРНЫХ ВЕДАЎ

У якасці самастойнага філасофскага паняцця культура ўваходзіць у шырокі ўжытак пачынаючы толькі з XVII ст. У якасці ж асобнага прадмета навуковых ведаў яшчэ пазней – з канца XIX ст. Галоўным словам філасофскага лексікона XVII і XVIII стст. было слова «прырода». Гэта час станаўлення і развіцця навук аб прыродзе : матэматыкі, фізікі, астраноміі. Усе адказы на пытанні, якія тычыліся чалавека, шукалі ў прыродзе. У азначаны перыяд на Беларусі з'яўляецца шэраг філосафаў, якія з дапамогай законаў развіцця прыроды імкнуліся растлумачыць асноўныя прынцыпы ўладкавання грамадства, а таксама пэўныя з'явы культуры. Маюцца на ўвазе працы Лукі Залускага «Агульная філасофія», «Практычная філасофія», «Тэарэтычная філасофія», Казіміра Нарбута «Эклектычная філасофія», Станіслава Шадурскага «Фізіка, або Філасофія прыроды», Сцяпана Аскеркі «План, які не з'яўляецца нормай», Анёла Доўгірда, Яна Зноскі, Мікалая Судзілоўскага, М. Ю. Якубовіча і інш.

У XIX ст. ключавымі словамі становяцца словы «грамадства» і «гісторыя». У дадзены час нараджаюцца сацыялогія і сучасная гістарычная навука. Менавіта тады пачынаецца ўсведамленне грамадскай сутнасці чалавека, сфарміраванае гісторыяй. Грамадства стала інтэрпрэтавацца як сутнасць надындывідуальная, аўтаномная ў адносінах да дзяржавы і адначасна якая знаходзіцца ў аснове дзяржавы. І толькі ў канцы XIX – пачатку XX ст. прыходзіць усведамленне таго, што побач з прыродай і сацыяльнай рэальнасцю існуе яшчэ адна – культурная, якая ў адносінах да чалавека носіць, магчыма, больш фундаментальны характар, чым першыя дзве. Чалавек ёсць культурная сутнасць, прадукт культуры, што ў многім вызначае яго існаванне як прыроднай і грамадскай істоты. «Культура» становіцца дамінантным паняццем. Безумоўна, паняцце гэта існавала ў еўрапейскім свеце і да XIX ст., але яно не разглядалася як асноватворны тлумачальны прынцып і насіла латэнтны характар. Навукоўцы лічылі, што адны грамадствы валодаюць культурай, а другія пазбаўлены культуры. Народы свету падзяляліся на Naturvölker і Kulturvölker. У сувязі з гэтым і гісторыя чалавецтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзялялася на дзікунства, варварства і цывілізацыю. Месца культуры ў дадзены перыяд было падначаленым у адносінах да грамадства, больш вузкім, раствораным у грамадстве і адносілася ў пэўнай ступені да яго ідэалу, мэты. Культура вызначалася пераважна праз грамадства. Менавіта грамадства лічылася адметнай прыкметай культуры. Цяпер культура, наадварот, стала разглядацца як прыкмета чалавечай супольнасці. Можна сцвярджаць, што тэрмін «культуралогія» наогул з'яўляецца вынаходніцтвам гэтага стагоддзя.

Другая палова XIX – пачатак XX ст. адзначаны своеасаблівым культуралагічным бумам, у ходзе якога ўсе гуманітарныя навукі як бы павярнуліся тварам да культуры. У Беларусі пачынаецца бурнае развіццё этнаграфіі. Вывучаць матэрыяльную і духоўныя культуру беларускага этнасу, культурна-гістарычныя ўзаемаадносіны з іншымі народамі пачынаюць П. В. Баброўскі, І. В. Дабравольскі, З. Я. Даленга-Хадакоўскі, М. В. Доўнар-Запольскі, А. Я. Ельскі, С. Кавалеўская, К. П. Тышкевіч, М. Федароўскі, П. М. Шпілеўскі і інш. Этнаграфія трактуецца пераважна як культурная антрапалогія. Навукоўцы адкрываюць багацейшыя слаі беларускай этнічнай культуры, адметную фальклорную спадчыну. Фарміруецца такая галіна гуманітарнай навукі, як фалькларыстыка. 700 прац па фальклоры, славістыцы напісаў Я. Ф. Карскі, у тым ліку тры тамы энцыклапедыі па беларусазнаўстве «Беларусы». Дваццаць грунтоўных прац па фальклоры Віцебшчыны выдае М. Я. Нікіфароўскі, 9 тамоў фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў выдае Е. Р. Раманаў (планаваў 15), 5 тыс. народных песень, 10 тыс. прыказак, казак, легенд сабраў і апрацаваў М. Федароўскі, зборнік «Беларускія народныя песні» выдадзены П. В. Шэйнам, І. А. Сербаў першы стварыў фотатэку (5 тыс. адзінак) тыпаў адзення, жылля, гаспадарчых пабудоў, рамёстваў Палесся. Краязнаўствам займаліся такія знакамітыя асобы, як А. Я. Багдановіч, І. А. Гашкевіч, І. І. Долгаў, А. А. Дунін-Горкавіч, А. Ходзька, Я. Чачот, М. А. Янчук, М. Г. Яцко і інш. Імі выказана ідэя аб беларускай культуры як цэласнай шматвяковай гістарычнай з'яве, аб самастойнасці беларускай мовы. Яны аргументавалі самабытнасць беларусаў як суб'ектаў багатай, арыгінальнай культуры, старажытных традыцый.

Так філасофія культуры, гісторыя культуры, этнаграфія, фалькларыстыка выходзяць на адно з першых месц у агульным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складзе сацыягуманітарных ведаў у сферы даследавання беларускай культуры.

У 1922 г. намаганні даследчыкаў беларускай культуры аб'ядноўваюцца: ствараецца Інстытут беларускай культуры, у якім працуюць Я. Ф. Карскі, С. М. Некрашэвіч, Я. Колас, Я. Купала, І. Ю. Лёсік. Пазней узнікае яшчэ адна галіна сацыягуманітарных навук – лінгвакультуралогія як частка этналінгвістыкі, якая пачынае займацца вывучэннем і апісаннем карэспандэнцыі мовы і культуры ў іх сінхронным узаемадзеянні.

Такім чынам, беларуская культура сёння – аб'ект даследавання не адной культуралогіі, а шэрагу сацыягуманітарных навук. Аднак неабходна заўважыць, што абазначаныя навукі вывучаюць не адну і тую ж культуру. Кожная з сацыягуманітарных дысцыплін вывучае канкрэтны аспект з'явы ці культурнага працэсу. Культура ў межах розных сацыяльных тэорый пераўтвараецца ў нейкую базавую інстанцыю, тлумачальны прынцып, парадыгму, да якой звяртаюцца для даследавання тых альбо іншых праблем сацыяльнага развіцця. Паняцце «культура» пранікае ў самыя розныя сацыяльныя навукі і займае ў іх цэнтральнае месца. У пэўным сэнсе слова «культура» ў сацыягуманітарных тэорыях выступае як аналаг Марксава паняцця «базіс». На аснове гэтага базісу сфарміраваліся альбо знаходзяцца ў стадыі станаўлення сацыялогія культуры, эканоміка культуры, геаграфія культуры, палітычная культуралогія, культуралогія рэлігіі, прыкладная культуралогія, геаграфія культуры, гісторыя культуры, культураметрыя. У той жа час неабходна адзначыць, што навука аб культуры набыла ўласную метадалагічную базу, што і праявілася ў фарміраванні самастойнай навукі аб культуры, якая (прыкладна сто гадоў назад) Л. Уайтам была названа культуралогіяй і на постсавецкай прасторы набыла другую радзіму. Паўстае пытанне: «Для чаго патрэбна яшчэ адна асобная навука, якая вывучае культуру?» Справа ў тым, што названыя вышэй сацыягуманітарныя навукі не займаюцца сістэмным, комплексным даследаваннем заканамернасцей развіцця і функцыянавання культуры, яе марфалогіі і дынамікі, тлумачэння каштоўнасных і гнасеалагічных аспектаў. Сёння беларуская культуралогія, як і любая іншая навука, мае ўласны прадмет даследавання і канкрэтныя метады, якія садзейнічаюць атрыманню дакладных культуралагічных ведаў. У адрозненне ад культурнай антрапалогіі яна звернута да ўсіх гістарычных перыядаў, а не толькі да архаікі, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў адрозненне ад сацыяльнай антрапалогіі – не толькі да сацыяльных структур.

У Беларусі да канца 90-х гг. мінулага стагоддзя аформіліся навуковыя цэнтры, якія спрабуюць асэнсаваць сучасныя культурныя працэсы і з’явы, тэарэтычныя праблемы культуры. Найбольш істотны ўнёсак у распрацоўку актуальных культуралагічных праблем належыць вучоным Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Пры Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў з 1998 г. функцыянуе аспірантура па спецыяльнасці 24.00.01 «Тэорыя і гісторыя культуры» і савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Вучоныя ўніверсітэта займаюцца даследаваннем сацыядынамікі культуры, рухаючых яе грамадскіх фактараў, сацыяльных механізмаў культуры. Ва ўніверсітэце падрыхтаваны і выдадзены шэраг прац, прысвечаных вывучэнню ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сацыяльнага быцця ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры. Найбольш значныя з іх «Философия культуры» [7], «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» [11], «Белорусы. От “тутэйшых” к нации» [12], «Архитектурная герменевтика» [9], «Музыкальное творчество как социокультурное явление» [13] и др. Сучаснымі вучонымі краіны І. У. Вараб’ёвай, І. М. Врановіч, С. У. Данскіх, Л. К. Кухто, Ю. Г. Болатавай, Э. А. Усоўскай, В. В. Калацэем, А. А. Спірынай, А. А. Сушай, Т. А. Сухоцкай завершаны даследаванні дынамікі і базавых кампанентаў каштоўнасных арыентацый суб’ектаў культуры ва ўмовах мадэрнізацыі сацыякультурнага асяроддзя, станаўлення і развіцця сучаснай культуры, аксіялагічных і структурных складнікаў мастацкай культуры, пытанняў генезісу, тыпалогіі і механізмаў самазахавання нематэрыяльнай традыцыйнай культуры, ролі і месца ў структуры культурнага арганізма этыкі і рэлігіі, іх узаемадзеяння.

Цікавыя даследаванні культуры пэўных сацыяльных арганізмаў, якія існуюць у адпаведных прасторава-часавых межах, а таксама культуры рэгіёнаў праводзяцца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце пад кіраўніцтвам прафесара Ч. С. Кірвеля. У гэтым ВНУ інтэнсіўна вядзецца праца па даследаванні этнасацыяльных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурных працэсаў (перш за ўсё памежных рэгіёнаў), што дазволіла ў выніку стварыць сумесна з Дзяржкамітэтам па справах рэлігіі і нацыянальнасцей Цэнтр этнасацыяльных і сацыякультурных даследаванняў.

Беларускія культуролагі не маглі пакінуць без увагі разнастайныя культурныя тэксты, у тым ліку мастацкія тэксты. Тым больш, што культуралагічная рэфлексія ў заходнееўрапейскіх краінах і Расіі ўжо трывала прапісалася ў мастацтве і літаратуры. Значная колькасць прац Р. Барта [2; 3], М. М. Бахціна [4], В. У. Іванова [5], Ю. Крысцевай [6], Д. С. Ліхачова [8], У. Я. Пропа [10], У. М. Тапарова [5], Г. А. Анціпава [1] і іншых навукоўцаў тычыцца метадалогіі культуралагічных ведаў у літаратуразнаўстве. М. М. Бахцін у працы «Эстетика словесного творчества» падкрэсліваў, што «литература – неотрывная часть культуры, ее нельзя понять вне целостного контекста всей культуры данной эпохи» [4, с. 329]. Сапраўды, літаратурны тэкст створаны з мноства раўнапраўных кодаў, у сваю чаргу, ён сам аказваецца ўплецены ў бясконцую тканіну культуры, з'яўляецца яе памяццю, прытым памятае не толькі культуру мінулага і цяперашнюю, але і прадбачыць культуру будучага. Менавіта таму выяўленне культуралагічных па сваёй сутнасці рэфлексій у творчай спадчыне творцаў і іх грунтоўны культуралагічны аналіз становяцца адной з актуальных праблем айчыннай тэорыі і гісторыі культуры.

Такім чынам, можна канстатаваць, што беларуская культуралогія як навука аб культуры ў першым дзесяцігоддзі XXI ст. дасягнула сталага ўзроўню развіцця і ўжо набыла пэўную сістэмнасць, якая дазваляе прэтэндаваць на асэнсаванне шэрагу праблем, якія ў сумежных навуках да гэтага часу не атрымалі глыбокага асвятлення. Сучасны культуралагічны дыскурс уяўляе сабой шырокі спектр тэхнік аналізу, прадстаўленых шматлікімі тэорыямі і канцэпцыямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Антипов, Г. А.* Текст как явление культуры / Г. А. Антипов. – Новосибирск : Наука, Сибирское отделение, 1989. – 197 с.

2. *Барт, Р.* Литература и значение / Р. Барт // Избранные работы. Семиотика. Поэтика. – М. : Прогресс, 1989. – С. 276–296.

3. *Барт, Р.* От произведения к тексту / Р. Барт // Избранные работы. Семиотика. Поэтика. – М. : Прогресс, 1989. – С. 413–423.

4. *Бахтин, М. М.* Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М. : Искусство, 1979. – 423 с.

5. *Иванов, В. В.* Славянские языковые моделирующие семиотические системы (Древний период) / В. В. Иванов, В. Н. Топоров. – М. : Наука, 1965. – 246 с.

6. *Кристева, Ю.* Разрушение поэтики / Ю. Кристева // М. М. Бахтин : pro et contra / сост. и коммент. К. Г. Исупова ; библ. О. С. Осьмухиной, Т. Г. Юрченко, О. Е. Оссовского, Н. Б. Паньковой. – СПб. : РХГИ, 2002. – Т. 2 : Творчество и наследие М. М. Бахтина в контексте мировой культуры.– 712 с.

7. *Крукоўскі, М. I.* Філасофія культуры. – М. : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

8. *Лихачев, Д.* Избранные работы : в 3 т. / Д. Лихачев. – Л. : Худож. лит., 1987. – Т. 1. – 656 с.

9. *Морозов, И. В.* Герменевтика зодчества / И. В. Морозов. – Минск : Стринко, 2009. – 352.

10. *Пропп, В. Я.* Фольклор и действительность / В. Я. Пропп. – М. : Наука, 1989. – 233 с.

11. *Смолік, А. І.* Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме / А. І. Смолік. – Мінск : Бел. ун-т культуры, 1999. – 247 с.

12. *Чернявская, Ю. В.* Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. В. Чернявская. – Минск : ФУАинформ, 2010. – 512 с. : ил.

13. *Шумская, И. М.* Музыкальное творчество как социокультурное явление / И. М. Шумская. – Минск : БНТУ, 2006. – 121 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ